# “ПРОСТАЙ РАДАСЦЮ БАГАТЫ”

***Вечар- партрэт, прысвечанае 50-годдзю з дня нараджэння Алеся Пісьмянкова***

.

*/на сцэне: юбілейная эмблема вечара, з дзвюх старон сцэны два столікі з кветкамі для шаноўных гасцей, каля сцэны разгорнута кніжная выстава “Не знікай…”*

*Гучыць лірычная мелодыя. На яе фоне чытальнік паза сцэнай чытае:*
*“ ... Они уходят, не допев куплета,*
*Когда в их честь оркестр играет туш –*
*Актёры, музыканты и поэты –*
*Целители уставших наших душ”. И. Тальков*
*/Выходзіць чытальнік да мікрафона і чытае верш /*

Крылатыя вершы і думкі твае,
А голас на плошчу, на волю імкнецца,
Хоць ён ад аблокаў, да нябёс дастае,
Пачуйце, як сэрца паэтава б’ецца!
Ад шчасця і прагі любіць і тварыць
На сцэне, здаецца, як раз разарвецца,
Ажно мікрафон захлынуўся, фаніць…
І ва ўнісон б’ецца тысяча сэрцаў!
Як быццам ударылі храмы ў званы,
Якія то радасць, то сум навяваюць –
А там, на радзіме салоўкі з вясны
На вершы Алесевы песні спяваюць.

*( гучыць песня “Белы камень” на словы А. Пісьмянкова*)

На сцэну выходзяць два вядучых:
Вядучы 1: Добры дзень шаноўныя сябры!
Вядучы 2: Мы рады вітаць Вас на гэтай сустрэчы, прысвечанай нашаму земляку Алесю Пісьмянкову – паэту, якому ў гэтыя дні, а дарэчы 25 лютага, споўнілася б 50 год.

Вядучы 1: Зусім рана, імгненнай знічкаю ўзляцеў ён у нябёсы, пакінуўшы за сабой доўгі шлейф паэтычных радкоў пра Беларусь, родную зямлю, пра Бесядзь. Ён быў паэтам, які пісаў душой, выпраменьваючы з унутраннага сусвету даверлівае святло і чысціню.

Вядучы 2: Ён ранкам падкову знайшоў у расе,
Шчаслівчык, адораны лёсам,
І кожны падумаў: дамоў панясе!
А ён – шпурлянуў у нябёсы!
“Будзем, людзі шчаслівыя ўсе!”

Вядучы 1: Рамантычна ўзнёслы стан паэта перадаецца і нам, чытачам. Зайдросны дар героя Алеся Пісьмянкова – гэта яго шчодрасць душы і чалавекалюбства.

ВЯДУЧЫ 2: чытае з кнігі А.Пісьмянкова “Думаць вершы”:

…“Даўно вядома, што пісьменнік сам творыць сваё жыццё і свой свет, свет, якога між іншым, да яго не было. І калі гэты свет створаны таленавіта, ён становіцца рэальнасцю. У ім свеціць сонца, ідзе дождж, спяваюць птушкі, гамоняць людзі….. словам, усё ідзе спрадвечным ладам.”

Вядучы 1: На юбілейную ўрачыстую сустрэчу сабраліся сягодня паэты-аматары касцюковіцкага краю, прадстаўнікі адміністрацыі раёна, творчай інтэлегенцыі раёна, а таксама шматлікія госці. Мы запрашаем падняцца на сцэну гасцей і гаспадароў нашай паэтычнай вечарыны:

(

)

Вядучы 2: Пісаў Алесь Пісьмянкоў у сваіх вершах пра тое, што было ягонаму сэрцу люба і дарага, што спадарожнічала яму з маленства, ад нараджэння, і чым была напоўнена яго гэткая ўражлівая, а яшчэ ў большай ступені адкрытая душа.

Люты у валёнкі абуты,
Апрануты люты ў кажух,
Люты спрабуе на лютні
Апошні акорд завірух.
Чуеце лютага лютню?
У лютага слых абсалютны.

У паэта таксама абсалютны слых. Яго традыцыйная паэзія сілкавалася здаровым, народным светаўспрыманнем. На старонках ягоных кніг – пашана да Слова, пашана да Продкаў, пашана да роднай Зямлі.

Чытальнік: “Крыніца”

У радзінным крае, у зялёным гае
буду раны гаіць.
Там крыніца адна нават ноччу відна
аж да самага дна.
Туды прадзед хадзіў, дзед душу маладзіў
бацька сум саладзіў.
Яна ж мкне, всё імкне срэбра свеціць на дне
яго хопіць і мне.

Вядучы 1: Зборнікі вершаў Алеся Пісьмянкова “Белы камень”, “Чытаю зоры”, “Планіда”, “Вершы”, “Журавель над студней”, “Я не памру, пакуль люблю” добра вядомы прыхільнікам яго творчасці.

Вядучы 1: Бесядзь з малку гайдала яго на сваіх хвалях, яна ж калыхала і ягоныя мары, якія сягалі далёка-далёка за небакрай, што хаваўся за мройнасцю абсягаў. І гэтыя мілыя сэрцу вобразы не маглі не выліцца ў вершы.

Чытальнік на фоне музыкі:

Прысядае сонца нізка
І глядзіць у вочы рэк
Нібы маці над калыскай,
Нібы добры чалавек.

Ціха-ціха вечарэе,
А я памяць варушу
Вечар сум, бы зерне сее
У адкрытую душу.

Млеюць тонкія рабіны
У іх – вячэрні сум
Успаміны, успаміны,
Кветкі мар і кветкі дум.

Развітанні і сустрэчы,
Сум і радасць па чарзе,
Ну, гэты, гэты вечар,
Што ён сёння прынясе?

Вядучы 2: Пытанне гучала, але адказ на яго па сутнасці і не патрабаваўся, бо ён адказ гэты, канешне ж, быў звязаны з усім далейшым жыццём лірычнага героя, с тым жыццём, што пачыналася з ягонай роднай вёскі, ракі, з тых даляглядаў, якія памяць ніколі не выкрасліць са сваёй скарбонкі.

Чую побач голас ночы
Вёска ў бэзавам вянку
Глянь, бярозаньцы на плечы
Цемнавокі летні вечар,
Апусціў сваю руку.

Дагарэў пажар заходу
Спяць туманы над вадой
Пераплёўся з пахам мёду
Водар мяты маладой.

Вядучы 1: Алесь не пісаў вершы ў традыцыйным уразуменні гэтага слова. І нават не жыў вершамі, а думаў імі. Пра гэта чытачы даведаліся пазней, калі ў друку пачалі з'ўляцца ягоныя развагі, што паступова вылілася паводле аўтарскага вызначэння ў літаратурна-сентаментальнае падарожжа пад назвай "Думаць вершы". У ім прагучала прызнанне Пісьмянкова: "Паэты з уласнай практыкі ведаюць, што вершы не пішуць, вершы думаюць, вершы выношваюць і толькі потым запісваюць. Не выпадкова раней ў літаратуры дума існавала як жанр. Памятаеце у Лермантава – "Дума", у Янкі Купалы – "Думка", у Тараса Шаўчэнкі – "Дума"

"… Я ніколі не пісаў вершаў – я іх думаў."

Вядучы 2: Вершы Алесь думаў, крочачы за ваколіцу роднай вёскі Бялынкавічы, дзе імклівай стужкай разлілася рака ягонага маленства – Бесядзь.

Мая вёска, мая вёска
Сонца мар маіх надзей
Усміхаецца бярозка,
Сустракаючы людзей.

Тут і радасць і трывога,
Кожны кут мне дарагі,
Хлапчуком я басаногім
Рос ля Бесядзі ракі.

Тут харошымі дзенькамі
Ля зялёных явароў
Я з ваясёлымі дзядзькамі
Вудзіў шэрых пячкуроў.

Мая вёска, мая вёска
Сонца мар маіх надзей
Усміхаецца бярозка,
Сустракаючы людзей.

Вядучы1: Адзін з ранніх вершаў Алеся засведчыў аб тым, як хараша, на дзіва прачула–лірычна раскрываўся талент паэта ў яго юным узросце. Правільным будзе сцвярджэнне, што Алесь Пісьмянкоў – адзін з нямногіх, хто з першых жа сваіх творчых крокаў аказаўся гэтак ж цесна прывязаны да роднай яму бесядскай зямлі, а яшчэ адразу намацаў тую сцяжыну, што вядзе ў мінуўшчыну роднага краю, кранаецца самых вытокаў.

Чытальнік: "Родныя"

Над вёскай дымок гаркаваты
Размова касы з атавай.
У дом пад крылом буслiным
Жанчыны ідуць на радзіны.

Расчулены бацька на дзіва –
Сын нарадзіўся. Радзіміч.
Маці трывожыцца: “Сыне”.
Вочы ў сына сінія.
Радзіны.
Радзіміч.
Радзіма.

Вядучы 1: Срэбрам душы Алеся Пісьмянкова, яго быццём была Беларусь, асабліва родная касцюковіцкая зямля. Думы паэта заўжды вярталіся яго туды, дзе ён нарадзіўся. Там пахла яблыкамі і мёдам.

Чытальнік: І тут усё проста
І ўсё чалавечна.
Радзіны і ксціны,
Сябрыны,
Як вечна.
Паліны й Куліны
Сямёны й Мацьвеі
Без мараў
Пра вечнасць
Адвечнае сеюць.

Вядучы 2: Як піша вядомы беларускі крытык Алесь Марціновіч “Паэзія Алеся Пісьмянкова не можа не выклікаць захаплення… Ягоная паэзія вабіць да сябе нязмушанасцю радка і адначасова яго надзвычайнай ёмістасцю. Што нярэдка пераходзіць у філасофскую напоўненасць. Яна настолькі прачулая, што здаецца, усё, што напісана ім выплеснута з тваёй ўражлівай душы.

Чытальнік:”Вечар вынырнуў нясмела
Цені чорныя кладзе.
Сонца яблыкам паспелым
Хутка ў Бесядзь упадзе.

Вінны водар б’е у скроні,
Спелы яблык хмеліць пах
Уздыхаюць сумна коні
На мядовых берагах.

У туманы клічуць сосны
Нібы мачты караблёў.
Толькі мне збірацца позна-
Я ужо сэрца раскалоў.

І, відаць. Невыпадкова
Волю сціснулі ціскі
Я не той, не свой, вясковы
І зусім не гарадскі.

Чытальнік другі: Мой сад у снезе па калена
Азяб у золь і снегапад…
Табе не холадна, Алена?
Табе не холадна Алена
Табе не хочацца назад.

Мой сад зусім не салаўіны-
У ім ахрыплыя вятры.
У ім рабіна ды каліна,
У ім рабіна ды каліна –
Вось і усе яго дары.

Мой сад пусцее без дагляду
Яго сячэ калючы град
Ён замаркоціўся без свята…
Ён замаркоціўся без свята –
Табе не хочыцца назад?

Мой сад у снезе па калена
Азяб у золь і снегапад…
Табе не холадна, Алена?
Табе не холадна Алена
Табе не хочыцца назад.

Вядучы 1: З успамінаў беларускай паэткі Таццяны Мушынскай: “Не сябраваць з Пісьмянковым было проста не магчыма. Добразычлівасць, неверагодны аптымізм і уменне бачыць жыццё у гумарыстычных фарбах неяк адразу падкуплялі. Здаралася Алесь чытаў у голас вершы, як я пазней зразумела, якія былі напісаны нядаўна, або напярэдадні ноччу. Яго цікавіла думка слухача, уражанне… Такі давер не мог не кранаць, а гэты густы, дыякаескі бас гучаў так сакавіта, з раскатамі! Вочы круху прыжмураныя, з хітрынкай, пшанічныя вусы натапыраны …. (верш) слова………

Вядучы 2: Пісьмянкоў ніколі не пісаў вершаў прысвечаных пэўным датам, у яго няма паэм. У яго шмат невялікіх вершаў, мініяцюр, замалёвак, але якіх ёмістых! Як трэба любіць сваю зямлю, яе прыгажосць, каб напісаць так:

Узмакрэлы і босы
Бронзавы ад загара
Стомлены сенакосам
Ліпень прылёг памарыць.
Мёдам на ўсю Еўропу
Пахнуць стагі і копы.

Шэсць радкоў увесь верш “Ліпень”. “Я імкнулася нічога не прапусціць з напісанага ім – працягвае Мушынская. Бо ведала, што гэта сапраўднае Мастацтва. Музыка слова, глыбіня сэнсу, знітаваная з яснасцю формы, дарылі асалоду.

Люты у валёнкі абуты,
Апрануты люты ў кажух,
Люты спрабуе на лютні
Апошні акорд завірух.
Чуеце лютага лютню?
У лютага слых абсалютны.

У паэта таксама абсалютны слых. Яго традыцыйная паэзія сілкавалася здаровым, народным светаўспрыманнем. На старонках ягоных кніг – пашана да Слова, пашана да Продкаў, пашана да роднай Зямлі.

Чытальнік: "Крыніца"

У радзінным крае, у зялёным гае
буду раны гаіць.
Там крыніца адна нават ноччу відна
аж да самага дна.
Туды прадзед хадзіў, дзед душу маладзіў
бацька сум саладзіў.
Яна ж мкне, всё імкне срэбра свеціць на дне
яго хопіць і мне.

Вядучы 1: Зборнікі вершаў Алеся Пісьмянкова "Белы камень", "Чытаю зоры", "Планіда", "Вершы", "Журавель над студней", "Я не памру, пакуль люблю" добра вядомы прыхільнікам яго творчасці.

Нельга пакінуць і па заўвагай творы Алеся Уладзіміравіча напісаныя для дзяцей, якія увайшлі ў зборнікі "Заўзятары", "Уласуны-весялуны", "Мы з братам". Як успамінаюць сябры паэта: "Ён часта паўтараў вядомыя: "Для дзяцей трэба пісаць, як для дарослых, толькі яшчэ лепш". Яго дзіцячыя вершы узбагацілі дзіцячую беларускую літаратуру, бо густ і прыхільнасці чытача выхоўваюцца з самага дзяцінства. Прыгожыя, цікавыя дзецям, з густам і веданнем мовы, напісаныя вершы, адыгрываюць вялікую ролю ў выхаванні, яны фарміруюць павагу і цікапўнасць да нацыянальнай мовы і літаратуры. Нездарма Касцюковіцкая дзіцячая бібліятэка з снежня 2005 года носіць імя Алеся Пісьмянкова.

Вядучы 2: Ну, а зараз дзіцячая старонка. Мы запрашае на сцэну маленькіх чытачоў дзіцячай бібліятэкі.

(ідзе выступленне)

Вядучы1: Паміж тым, што напісана Алесем і па між ім самім, як асобай, існавала нейкая дзівосная гармонія. Уладу яго абаяльнасці адчувалі на сабе літаральна усе з кім ён быў знаёмы. Усе з кім сутыкаўся Алесь, свядома ці несвядома, адчувалі яго самабытнасць, магутнае, станоўчае біяполе.

Неверагодная добразычлівасць, абсалютная адсутнасць зайдрасці і дробезнасці. Ён на дзіва тонка адчуваў іншых. Умеў падтрымаць, падахвоціць, сказаць у голас пры ўсіх добрае слова.

Чытальнік: “Надзея”

Залатая мяцеліца
Зноў сярэбранай зменіцца.
Можа, усё пераменіцца
Можа, усё перамеліцца
Можа, ўсё , што засмечана,
Заіскрыцца,
Засвеціцца.
І забудзецца дробнае,
І згадаецца добрае,
І прыпомніцца роднае,
Векавое,
Нязводнае,
І з усмешкаю ветлаю
Павітаецца светлае.
Павітаецца.
Парукаецца .

Вядучы 2: Усё напісанае Алесем Пісьмянковым не толькі талентам народжанае, а і прапушчана праз ягонае сэрца, напоўненае любоўю да чалавека і безабароннае перад няшчырасцю і некалі прамоўленае ім сёння ўжо успрымаецца і ягоным голасам адтуль, з нематы і вечнасці.

Чытальнік:

Я прыеду, я вярнуся ,
Я прыйду да плыткай рэчкі,
Дзе самотны белы бусел
Думу думае аб вечным

Як і год, і два і дзесяць,
Мо яшчэ з сярэдневечча,
Ён вартуе рэчку Бесядзь,
Думу думае аб вечным.

Я вярнуся, пакланюся
І яму, і нашай рэчцы,
Я з ім ціха пажуруся
І падумаю аб вечным.

Пакланюся, пажуруся
І ў тумане знікну заўтра…
Белы бусел, белы бусел,
Мой задумлівы сааўтар.

Да чытальніка далучаюцца маладыя паэты-аматары і чытаюць па чарзе:
1-й: Адарваўся чалавек ад зямлі і паплыў угару – як дым, як здань, як балючая думка.
2-гі: Як Музыка, якога мы чулі – і ведалі, што голас яго – музыка.
3-ці: Як Чараўнік, якому глядзелі ў вочы – і бачылі, што гэта вочы мудраца.
4-ты: Як Паэт, якога мы чыталі і слухалі – і разумелі, што гэта ад – зямлі, ад Бога.
5-ты: А ён быў проста Чалавек, які любіў жыццё і ўсё жывое.
6-ты: І ён аднойчы адарваўся ад зямлі, ад сям'і, ад сяброў і паплыў у Неба. Да Бога. Можа, каб застацца між людзей Паэтам? ….

Вядучы 1: Дзякуй ўсім за ўдзел у нашай вечарыне.
Вядучы 2: Да пабачэння, да новых творчых сустрэч.

*Гучаць у запісу песні на словы А.Пісьмянкова.*